

*Атык палаца Станіславаўскай сядзібы ў Гродне.*

грабеньчаты (складаецца з цокальнага фрыза і завяршальнага зубчатага грэбеня), шчытавы (утвораны шэрагам шчытоў). У Беларусі вядомы з 16 ст. ў рэнесансных палацах (*Гродзенскі Стары замак*, *Рагачоўскі палац*), грамадскіх будынках (*Нясвіжская ратуша* і гандлёвыя рады), храмах (*Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква*, *Смаргонскі кальвінскі збор*). У наш час пашыраны ў архітэктуры жылых і грамадскіх пабудоў. А. называецца таксама нізкі верхні паверх над карнізам, які адрозніваецца ад ніжніх больш сціплым аздабленнем і ссунуты ад плоскасці гал. фасада.

**АТЭІ́ЗМ** (франц. athéisme ад грэч. atheon бязбожжа), сістэма поглядаў, якая адмаўляе ўяўленне пра Бога. Існуе ў розных формах: рэліг. вольнадумства; сумненне ў магчымасці пазнання Бога (агнастыцызм), катэгарычнае адмаўленне быцця Бога і ўвогуле звышнатуральных з'яў (радыкальны А.). Адрозніваюць А. практычны і тэарэт. (у т.л. навук., гуманіст. і паліт.). У антычную эпоху атэістамі лічылі тых, хто не прызнаваў багоў афіц. культу (Сакрат). У Стараж. Грэцыі прадстаўнікамі ўсвядомленага А. былі філосафы Дэмакрыт, Эпікур, сафісты (Пратагор, Горгій), раннія кінікі і скептыкі. У далейшым змест А. вызначалі развіццё навукі і станаўленне грамадства. У 20 ст. А. разглядаўся з боку гледжання экзістэнцыялізму: здабыванне чалавекам свабоды і мужнасці заставацца самім сабой насуперак сілам, якія імкнуцца пазбавіць сэнсу ягонае жыццё (Ж.-П.Сартр, А.Камю). Найб. распаўсюджаны тып А. — матэрыялістычны светапогляд — перакананне ў тым, што ў навук. уяўленні пра сусвет не застаецца месца для Бога і звышнатуральных з'яў (Ж.Ламетры, П.Гольбах, Л.Феербах, К.Маркс). Неапазітывісты (Р.Карнап, М.Шлік) меркавалі, што аднолькава немагчыма праверыць сцвярджэнні як пра існаванне Бога, так і пра яго адмаўленне. Гуманіст. А. пабудаваны на ўяўленні пра чалавека як творцу самога сябе і гісторыі: чалавек з дапамогай розуму і навукі вырашае свае праблемы быцця, што было б немагчыма толькі з дапамогаю веры ў Бога (Б.Расел). У аснове А. можа быць перажыванне недасканаласці свету і адмаўленне Бога з прычыны панавання зла навокал.

У грамадскай думцы Беларусі ідэі А. пачалі пашырацца ў 16—17 ст. (К.Бекеш, С.Лован, К.Лышчынскі і інш.). Моцным штуршком для развіцця А. стаў рэфармацыйны і гуманіст. рух і звязаны з ім рэліг. скептыцызм (С.Будны, В.Цяпінскі, Я.Ліцыній Намыслоўскі). Атэістычныя тэндэнцыі праяўляліся ў творчасці К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча, Я.Лучыны і інш. Пасля Кастр. рэв. 1917 пачалося глабальнае разбурэнне рэлігійнасці, у дыялектычным матэрыялізме А. стаў састаўной часткай камуніст. ідэалогіі, сродкам супрацьдзеяння ідэалагічнаму рэліг. іншадумству. Пасля набыцця Беларуссю дзярж. незалежнасці (1991) пачалася пэўная трансфармацыя масавага светапогляду, сфера распаўсюджання А. звузілася.

*Літ.*: Из истории свободомыслия и атеизма в Беларуси. Минск, 1978; Свободомыслие и атеизм в древности, средние века и в эпоху Возрождения. М., 1986; Круглов А.А. Развитие атеизма в Белоруссии. Минск, 1989; Падокшын С.А. Філасофская думка Беларусі эпохі Адраджэння: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990.

*В.Р.Языковіч.*

**«АТЭНЭ́УМ»** («Athenaeum»), часопіс, які выдаваў у 1841—51 у Вільні на польскай мове пісьменнік Ю.І.*Крашэўскі*. Асвятляў праблемы гісторыі, культуры, грамадска-паліт. жыцця гал. чынам зямель б. ВКЛ — Беларусі, Літвы, а таксама Украіны і Польшчы, змяшчаў літ.-маст. творы. Найб. грамадскі рэзананс часопіс меў у 1842—48, калі на яго старонках змяшчаліся матэрыялы, аўтары якіх выступалі супраць феадальных парадкаў, за вызваленне сялян ад прыгону, вялі палеміку з групоўкай рэакцыйных дзеячаў «Заходняга краю» на чале з Г.Ржавускім, М.Гарбоўскім і інш. У часопісе дамінавала гіст. тэматыка. Змешчаны арт. Ю.І.Крашэўскага «Літва ў часы Вітаўта» (1849, т. 2), Я.Тышкевіча «Пра нядаў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ